)

Тэст па Лексікалогіі

**1. Адзначце канструкцыі з амонімамі.**

I. 1) спартыўныя клубы – клубы дыму

2) штучны лёд – штучныя тавары

3) гасіць лямпу – гасіць доўг

4) шчабеча ў кустах чачотка – танцаваць чачотку

5) музычная гама – гама фарбаў

Адказ: 1; 2; 4

II. 1) выпрабавальны тэрмін – прыехаць у тэрмін

2) нумар дома – эстрадны нумар

3) ехаць у экіпажы – экіпаж карабля

4) парк культуры – трамвайны парк

5) пісталет на ўзводзе – камандзір узвода

Адказ: 2; 3; 5

III. 1) пайсці на каток – выраўноўваць грунт катком

2) дробная бульба – дробны гандаль

3) нарасказваць баек – апрануць байку

4) крытычны артыкул – крытычнае становішча

5) водгукі грому – водгукі мінулага

Адказ: 1; 3

IV. 1) электрычны ланцуг – горны ланцуг

2) лава вулкана – сесці на лаве

3) душэўны спакой – душэўны чалавек

4) заплесці касу – затачыць касу

5) паставіць каравул – крычаць “каравул”

Адказ: 2; 4; 5

V. 1) гранатавы сок – гранатавы бранзалет

2) клетка для тыгра – тканіна ў клетку

3) праязны білет – білет у кіно

4)працоўныя будні будні дзень

5) ганаровы госць – ганаровыя абавязкі

Адказ: 1; 2; 4

2. **Адзначце сінанімічныя рады.**

I. 1) выратаванне, ратунак, збавенне

2) збочыць, задарожыцца, павярнуць

3) вязнуць, грузнуць, засядаць

4) вялізны, агромністы, гіганцкі

5) галлё, вецце, хмызняк

Адказ: 1; 3; 4

II. 1) гіпотэза, даследаванне, меркаванне

2) ільдзіна, крыга, смуга

3) гарэць, палаць, палыхаць

4) сапраўдны, рэальны, праўдзівы

5) неспадзявана, раптам, навыперадкі

Адказ: 3; 4

III. 1) урачыста, па-святочнаму, узнёсла

2) грамада, натоўп, гурт

3) папялішча, руіны, гарадзішча

4) граніца, мяжа, рубеж

5) папракаць, помсціць, упікаць

Адказ: 2; 4

IV. 1) постаць, фігура, аблічча

2) былое, мінулае, старасветчына

3) графіка, правапіс, арфаграфія

4) гурт, чарада, кампанія

5) граніца, мяжа, рубеж

Адказ: 2; 4; 5

V. 1) марна, дарэмна, нізавошта

2) паасобку, разам, супольна

3) жэрдка, жардзіна, шост

4) ушчэнт, дачыста, дарэшты

5) развіццё, станаўленне, росквіт

Адказ:1; 3; 4

**3. Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, у якіх парушчана лексічная спалучальнасць слоў.**

I. 1) святочная жалоба

2) атрымаць перамогу

3) святочны настрой

4) дваццаціпавярховая хата

5) чэрствы хлеб

Адказ: 1; 4

II. 1) чэрствае сэрца

2) атрымыць поспех ў барацьбе

3) чэрствая зямля

4) святочны абед

5) асцярожна разбіць посуд

Адказ: 2; 3; 5

III. 1) асцярожна глядзець

2) чарада падзей

3) надзейны сябар

4) асцярожна ступаць

5) чарада вярблюдаў

Адказ: 1; 5

IV. 1) разгорнутая кніга

2) надзейны вораг

3) аказаць шкоду суседу

4) чарада птушак

5) бязмежныя палеткі

Адказ: 2; 3

V. 1) дзверы і вокны разгорнуты насцеж

2) хлопец зачыніў вочы

3) чарада рыб

4) аказаць дапамогу суседу

5) хата з саламянымі стрэхамі

Адказ: 1; 2

**4. Адзначце фразеалагізмы, якія маюць указанае значэнне.**

I. *Вельмі хутка, імкліва* (бегчы, кідацца, пускацца і пад.):

1) без аглядкі

2) высалапіўшы язык

3) як мокрае гарыць

4) што ёсць духу

5) выскаліўшы зубы

Адказ: 1; 2; 4

II. *Вельмі моцна* (спаць):

1) як пшаніцу прадаўшы

2) на адно вока

3) сном праведніка

4) як чарапаха

5) як забіты

Адказ: 1; 3; 5

III. *Вельмі дрэнна, без ахвоты і старання* (рабіць, працаваць):

1) не пакладаючы рук

2) абы з рук

3) пусці павалюся

4) цапу-лапу

5) закасаўшы рукавы

Адказ: 2; 3; 4

IV. *Праставаты, някемлівы чалавек*:

1)дубовая галава

2) мех з саломай

3) з мухамі ў носе

4) пень асінавы

5) боб з гарохам

Адказ: 1; 2; 4

V. *Дабівацца добрага становішча, поспехаў у жыцці*:

1) хапаць зоркі з неба

2) выбівацца ў людзі

3) ісці ўгору

4) прабіваць сабе дарогу

5) вынаходзіць веласіпед

Адказ: 2; 3; 4

**5. Адзначце рады, у якіх запісаны антанімічныя ўстойлівыя выразы**

I.
1) (зрабіць) у першую галаву –у першую чаргу
2) (начальнік) без клёпкі ў галаве – светлая галава
3) (агледзець) з галавы да ног – з ног да галавы
4) (гаварыць) вочы ў вочы – за вочы
5) апускаць лейцы – закручваць гайкі

Адказ: 2; 4; 5

II.
1) у кожнай кішэні па жмені – кот наплакаў
2) (ягад, грыбоў) хоць адбаўляй – бяры не хачу
3) абы дзень адбыць – сяк-так накасяк
4) (працаваць) цераз пень калоду – не пакладаючы рук
5) (хлопец) аршын з шапкаю – з каломенскую вярсту

Адказ: 1; 4; 5

III.
1) аж пяткі блішчаць – як чарапаха
2) адзін пад адзін – як на падбор
3) адкрыць сэрца – выліваць душу
4) адстаўной казы барабаншчык – птушка высокага палёту
5) дзясятая вада на кісялі – свая кроў

Адказ: 1; 4; 5

IV.
1) слова не пазычае – цяляты язык аджавалі
2)воўк у авечай скуры – душа наросхрыст
3) (з’явіўся) ні адсюль ні адтуль – як снег на галаву
4) з гулькін нос – куры не клююць
5)(абед) за вушы не адцягнеш – язык

Адказ: 1; 2; 4

V.
1) бабка надвое варажыла – віламі па вадзе пісана

2) першая скрыпка – заключны акорд

3)пустая галава – светлая галава

4) як кот з сабакам – душа ў душу
5) даць ход (справе) – пакласці пад сукно

Адказ: 3; 4; 5

**6. Адзначце сказы, уякіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні.**

I. 1)Дзяўчаты з усмешкай дарылі букеты. І вось загарэлася *полымя* кветак.

2)Матчынай зямлі *карэнне* ніколі не адпусціць нас.

3)Бацька падарыў *залаты* пярсцёнак.

4) Бабуля накрыла мяне *цёплай*коўдрай.

5) У маёй матулі *цёплая* ўсмешка.

Адказ: 1; 2; 5

II. 1) У пакоі было *чыста*.

2)Калі мы ад’язджалі, у маці былі *мокрыя* вочы.

3)Сукенка была *мокрая* ад дажджу.

4)Усё! Цяпер можна з *чыстым* сэрцам ісці дадому.

5) Характар у бацькі *цяжкі*.

Адказ: 2; 4; 5

III. 1) Такія людзі выклікаюць самыя *цёплыя* пачуцці.

2) Сонечнае *святл*о не прабівалася праз галіны.

3) Ноччу пачалася *завіруха*.

4) Не сціхла спрэчак *завіруха*.

5) Перад вачыма раскінулася вялікае *поле*.

Адказ: 1; 4

IV. 1)Скошаная трава *сохне* на лузе.

2) Мы ідзём *глухімі* сцежкамі.

3) У вёсцы жыў *глухі* чалавек.

4) Святло ад лямпы залівала ўвесь пакой.

5)*Поле* дзейнасці Івана было даволі шырокім.

Адказ: 2; 5

V. 1) Калі асядала магутнае шыпучае *полымя*, мы пяклі ў прысаку бульбу.

2)*Карэнне* дрэў густа перапляло дарогу.

3)*Сохне* хлопец па дзяўчыне.

4) Чалавек ішоў *стомленай* паходкай.

5) Хлопец, відаць, нёс *цяжкі* чамадан.

Адказ: 3; 4

**7. Вызначце правільны сучасны адпаведнік да наступнага архаізма:**

*I. Вакацыі*:

1)апладысменты

2)канікулы

3)віншаванні

4)пераможцы

5)экзамены

Адказ: 2

*II.* *Губерня*:

1)вобласць

2)рэспубліка

3)краіна

4)палац

5)дзяржава

Адказ: 1

*III.* *Ланіты*:

1)вусны

2)бровы

3)шчокі

4)валасы

5)вушы

Адказ: 3

*IV.* *Чало*:

1)нос

2)тулава

3)барада

4)лодка

5)лоб

Адказ: 5

*V.* *Печыва*:

1) печ

2) вогнішча

3)смага

4) выпечка

5) страва з бульбы

Адказ: 4

**8. Вызначце сінонімы да наступнага слова:**

I. *Балота*:

1)дрыгва

2)раўніна

3)багна

4)імшара

5)узгорак

Адказ: 1; 3; 4

II. *Гаварыць*:

1)крычаць

2)баіць

3)гаманіць

4)апавядаць

5)мовіць

Адказ: 2; 3; 4; 5

III. *Гарэць*:

1)палаць

2)палыхаць

3)патыхаць

4)згасаць

5)шугаць

Адказ: 1; 2; 4

IV. *Мужны*:

1)баязлівы

2)адважны

3)трывалы

4)бравы
5) адчайны

Адказ: 2; 3; 4

V. *Спакойны*:

1)бязмоўны,

2)рашучы

3)стрыманы

4)ціхі

5)маўклівы

Адказ: 1; 3; 4; 5

**9. Вызначце слова па яго лексічным значэнні.**

I. *Самае шаноўнае і сімвалічна значнае месца ў традыцыйнай хаце*:

1) комін

2) клець

3) покуць

4) бажніца

5)варыўня

Адказ: 3

II. *Народны звычайузаемадапамогі, калектыўнаядабравольнаяпраца "за пачастунак"*:

1) зажынкі

2) брама

3) дажынкі

4) гуканне вясны

5) талака

Адказ: 5

III. *Прадметы, якому прыпісвалімагічнуюздольнасцьзасцерагаць ад няшчасцяў і ад злых духаў:*

1) пацеркі

2) амулет

3) каралі

4) бранзалет

5) забабоны

Адказ: 2

IV. *Традыцыйнаяпрылада для памолу зерня, ручнымлын*:

1) жорны

2) апалонік

3)часалка

4) падбіўнік

5) верацяно

Адказ: 1

V. *Керамічная плітка для абліцоўкіпечаў, камінаў, сцен у памяшканні*:

1)набіліцы

2) пранік

3) полаз

4) кафля

5) падбіўнік

Адказ: 4

**10.Адзначце пары слоў-антонімаў.**

I. 1) разведка - контрразведка

2)бедны – багаты

3)павярнуць – шмыгнуць

4)ісці – крочыць

5)малы – стары

Адказ: 1; 2

II. 1)згінуў – прапаў

2) сіла - смеласць

3) стары – малады

4) учарашні – заўтрашні

5)вернасць – здрада

Адказ: 3; 4; 5

III. 1) дарагі – танны

2) да (лесу) – ад (лесу)

3) крывы – дзіравы

4)мабілізацыя – дэмабілізацыя

5) красны – шчасны

Адказ: 1; 2; 4

IV. 1) шукаць – знаходзіць

2) зблізку – здалёк

3) пад (страхой) – над (страхой)

4) прыгожы – непрыгожы

5) упасці – прапасці

Адказ: 2; 3; 4

V. 1) густа – пуста

2) любоў – каханне

3) падняцца – устаць

4) ваенны – антываенны

5)хутка – павольна

Адказ: 1; 4; 5

**11. Адзначце мнагазначныя словы**.

I. 1) корань

2)канюшына

3)загіб

4)квартал

5)дзверы

Адказ: 1; 3; 4

II. 1) акуляры

2)капа́ць

3)пяцёрка

4)аловак

5)праца

Адказ: 2; 3; 5

III. 1) клас

2)ліловы

3)віншаваць

4)адбітак

5)жыццё

Адказ: 1; 4; 5

IV. 1)коўдра

2)прыгожы

3)адзінота

4)вобраз

5)пярсцёнак

Адказ: 2; 3; 4

V. 1) залаты

2)кола

3)ключ

4)каска

5)літаратура

Адказ: 1; 2; 3; 5

**12. Адзначце ўстойлівыя выразы, у якіх на месцы пропуску трэба ўставіць указанае слова або яго формы:**

*I. нага*

1) быць на короткай _____

2) (трапіць) пад гарачую _____

3) перакласці з хворай _____ на здаровую

4) (жыць) на шырокую _____

5) адна _____ тут, другая там

Адказ: 1; 4; 5

*II.* *галава*

1) не знасіць мне _____

2) даць _____ на адсячэнне

3)крукам _____ не дастаць

4) (зваліўся) як снег на _____

5) паклаўшы руку на _____

Адказ: 1; 2; 4

*III.* *рука*

1) майстар на ўсе _____

2) (даведацца) з першых _____

3) (работы многа, ды) _____ не хапае

4) як левая _____ хоча

5) паставіць з ног на _____

Адказ: 1; 2; 3

*IV.* *лес*

1) _____ па калена

2) за дрэвамі не бачыць _____

3) расці на _____ гледзячы

4) шукай ветру ў _____

5) хто ў _____, хто па дровы

Адказ: 2; 3; 5

*V.* *нос*

1) ісці _____ у _____

2) павесіць _____

3) далей свайго _____ не бачыць

4) трымаць _____ па ветры

5) схапіць злодзея за _____

Адказ: 2; 3; 4

**13. Адзначце выразы, якія могуць ужывацца і як устойлівыя (фразеалагізмы), і як свабодныя.**

I.

1) ні даць ні ўзяць

2) адрэзаная луста

3) паставіць на ногі

4) абвесці вакол пальца

5) паказаць зубы

Адказ: 2; 3; 4

II.

1) прыкусіць язык

2) на скорую руку

3) з усіх ног

4)заткнуць за пояс

5) выцягнуць ногі

Адказ: 1; 4; 5

III. 1) развязаны рукі

2) ставіць кропку

3) закінуць вудачку

4) браць за жывое

5)западаць у душу

Адказ: 1; 2; 3

IV. 1) выходзіць сухім з вады

2) браць за горла

3) віляць хвастом

4) сам не свой

5) пэцкаць рукі

Адказ: 2; 3; 5

V. 1) намалоць дроў

2) ні жывы ні мёртвы

3) хата з краю

4) браць пад сваё крыло

5) пераліваць з пустога ў парожняе

Адказ: 1; 3; 4

**14.Адзначце агульнаўжывальныя словы.**

I. 1) дзіця

2)лагарыфм

3)праца

4)тусоўка

5)дом

Адказ: 1; 3; 5

II. 1) аловак

2)вечар

3)гіпатэнуза

4)высокі

5)баксы

Адказ: 1; 2; 4

III. 1)шпора

2)постфікс

3)раніца

4)заўтра

5)туды

Адказ: 3; 4; 5

IV. 1) новы

2)амонімы

3)чытаць

4)гарбач

5)чырвоны

Адказ: 1; 3; 5

V. 1) ровар

2)пісаць

3)фуганак

4)ноч

5)куды

Адказ: 2; 4; 5

**15.Адзначце стылістычна афарбаваныя словы.**

I. 1) лясок

2)думаць

3)пляткар

4)гаварыць

5)злева

Адказ: 1; 3

II. 1) даўно

2)швэндацца

3)місія

4)тысяча

5)мой

Адказ: 2; 3

III. 1) пяць

2)апошні

3)лес

4)кааліцыя

5)жэўжык

Адказ: 4; 5

IV. 1)брыдкі

2)дом

3)зялёны

4)інверсія

5)дарога

Адказ: 1; 4

V. 1) твой

2)плявузгаць

3)рты

4)першы

5)маланка

Адказ: 2; 5

**16.Адзначце семантычныя сінонімы.**

I. 1) важны – актуальны

2) страх – жах

3) адлегласць – дыстанцыя

4) акцёр – артыст

5) канткулы – вакацыі

Адказ: 2; 4

II. 1) ісці – крочыць

2) лоб – чало

3) касынка – хусцінка

4) прыстаўка – прэфікс

5)украсці – сперці

Адказ: 1; 3

III. 1) бегемот – гіпапатам

2) гультай – лайдак

3) малады – юны

4) ілгаць – брахаць

5) лес – бор

Адказ: 3; 5

IV. 1) асілак – волат

2) вялікі – гіганцкі

3) кантынент – мацярык

4) бяда – катастрофа

5) маланка – бліскавіца

Адказ: 2; 4

V. 1) радавацца – святкаваць

2) ацэнка – адзнака

3) намінатыўны – назыўны

4) арфаграфія – правапіс

5)разумны – геніяльны

Адказ: 1; 5

**17.Адзначце сказы, у якіх ужыта лішняе слова.**

I. 1) Трэба запоўніць анкету, напісаць сваю аўтабіяграфію.

2)Ля парога расла высокая бяроза, якая сваім галлём закрывала амаль увесь падворак.

3) Падарожнікі цікавіліся звычаямі карэнных абарыгенаў.

4) Мы з сябрамі марылі, дзяліліся планамі на будучае.

5) Колькасць абанентаў МТС перавысіла два мільёны.

Адказ: 1; 3; 4

II. 1) На левым, больш высокім беразе раслі старыя дубы.

2)Нягледзячы на позні час і непагоду, на вуліцы было шмат людзей.

3) Натоўп людзей не меншыўся. Наадварот, здавалася, што з кожнай хвілінай народу станавілася ўсё больш і больш.

4) Прыемна ў спёку адпачыць у ціхім заценены куточку парка.

5) Выплыў месяц з-за хмар, але на зямлі ўсё яшчэ панаваў цёмны змрок.

Адказ: 3; 5

III. 1) Максім нешта гаварыў і ўвесь час жэстыкуляваў рукамі.

2)Афарбоўка спіны і галавы гэтай жабы таксама служыць для маскіроўкі сярод раслліннасці, гнілога лісця, глебы.

3) Касцяк каманды застаецца нязменным на працягу трох гадоў.

4)Мы паехалі ў камандзіроўку разам з калегай па рабоце.

5) Загадкавая цішыня пануе ў наваколлі, аднак насцярожанае вуха зможа адрозніць безліч гукаў.

Адказ: 1; 4

IV. 1) Ззяла яркае, але не цёплае вясенняе вечаровае сонца.

2) Мы ішлі па лесе і любаваліся ляснымі дрэвамі і кветкамі.

3) На працягу месяца лютага працягласць сутак павялічыцца на дзве гадзіны.

4) Пражыўшы ў абарыгенаў амаль усё лета, мы паступова засвоілі многія іх звычаі.

5) На стале ляжала разгорнутая кніга.

Адказ: 2; 3

V. 1) Праплывалі па баках дарогі зубчатыя яліны, купчастыя прыдарожныя хвоі.

2) Валя абвязала шыю бацькавым шалікам.

3) Перад вачыма раскінуліся бязмежныя палеткі.

4)Першы прыйшоў малады юнак.

5) У паэме Я. Коласа “Новая зямля” вельмі цудоўна адлюстраваны пейжазныя малюнкі прыроды.

Адказ:1; 4; 5

**18.Адзначце сказы з антонімамі**.

I. 1) Аднаму густа, а другому пуста.

2) Вецер дзьме, не сунімаецца.

3) хто шукае, той знаходзіць.

4) Пакуль тоўсты пахудзее, дык худы памрэ.

5) Хараство прыглядзіцца, а розум прыгадзіцца.

Адказ: 1; 4

II. 1) Лепш з разумным згубіць, чым з дурнем знайсці.

2)Сем бед за раз – адзін адказ.

3) Мякка сцелюць, ды мулка спаць.

4)Цішэй едзеш – далей будзеш.

5)Дарога спусцілася ў лагчыну, паднялася на пагорак.

Адказ: 1; 3; 5

III. 1) Не радзіся краснай, а радзіся шчаснай.

2) Трапіў у нерат – ні ў зад ні ў перад.

3) Крывое ды дзіравае выпраўляць цяжка.

4)Малы жадае быць старэйшым.

5) Не будзь горкі і не будзь салодкі: горкага ппраплюююць, а салодкага праглынуць.

Адказ: 2; 5

IV. 1) І так згінуў, і так прапаў.

2) Сыты галоднаму не спагадае.

3) Дарога павярнула направа, шмыгнула ў хвойнік.

4) Ці плакаць, ці смяяцца – усё адно моршчыцца.

5) Стары быць хоча маладым.

Адказ: 2; 4; 5

V. 1) Што пасееш, тое і пажнеш.

2) Бярэ не сіла, а смеласць.

3) Больш я забыўся, як ты знаеш.

4)Што з воза ўпала, тое і прапала.

5)Пешы коннаму не таварыш.

Адказ: 1; 5